Итак, процесс моделирования структуры лирического героя осуществляется в неразрывности *я* и *мы*. Лирическое *мы* являет высокую степень общности людей, сформировавшуюся в физическом мире. Но синергетика этой общности столь велика, что *мы* физическое неизбежно трансформируется в *мы* этическое, мировоззренческое и – главное – передающее идею единения как высшую ценность человеческих взаимоотношений. Хочется надеяться, что неделимое *мы* останется в составе русского культурного кода, и поэзия продолжит быть гарантом его сохранения.

**Список использованной литературы:**


1. Борисова, Е.Г. Трансформация ценностно-смыслового кода в языке молодежи / Е.Г. Борисова // Верхневолжский филологический вестник. – 2019. – № 2. – С. 138–143.
2. Гранева И.Ю. Русские личные местоимения в свете интегрального описания языка: коммуникативно-прагматические, лингвокультурологические и когнитивно-дискурсивные аспекты: дис. … д-ра филол. наук : 10.02.01 / И.Ю. Гранева. – Нижний Новгород, 2022. – 498 с.
3. Норман Б.Ю. Русское местоимение мы: внутренняя драматургия / Б.Ю. Норман // Russian linguistics. – 2002. – № 26 (2). – С. 217–234.
4. Норман Б.Ю., Плотникова А.М. Конструкции с местоимением мы: формирование актуальной или окказиональной коллективной идентичности / Б.Ю. Норман, А.М. Плотникова // Вестник Новосибирского государственного педагогического университета. – 2016. – № 6 (34). – С. 126–138.
5. Синельникова Л.Н. Дискурсивная семантика русских местоимений. Коммуникативные сценарии в прозе и в поэзии / Л.Н. Синельникова. Издательство: LAP LAMBERT Academic Publishing, 2013. – 452 с.
6. Синельникова Л.Н. Дискурсивная семантика личных местоимений / Л.Н. Синельникова // Вестник Воронежского государственного университета. Серия: Лингвистика и межкультурная коммуникация. – 2020. – № 2. – С. 21–28.
7. Яковлева Е.Л. Опыт философского осмысления инклюзивного человека / Е.Л. Яковлева // Карельский научный журнал. – 2015. – № 4 (13). – С. 12–15.


## ГЛ.4. ПРОБЛЕМЫ ОСМЫСЛЕНИЯ И ИЗУЧЕНИЯ ТВОРЧЕСТВА СЛАВЯНСКИХ ПИСАТЕЛЕЙ В СОВРЕМЕННОМ ПОЛИКУЛЬТУРНОМ ПРОСТРАНСТВЕ ШКОЛ И ВУЗОВ




**Акушэвіч Андрэй Аляксандравіч** (**A. A. Akushevich**), кандыдат філалагічных навук, загадчык кафедры рыторыкі і методыкі выкладання мовы і літаратуры філалагічнага факультэта БДУ (*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*) (*Minsk, Republic of Belarus*); *a.akuszevicz@gmail.com*

УДК 821.161.3'04.09(092)

# ШЛЯХІ ПРЭЗЕНТАЦЫІ АСОБЫ І ТВОРЧАЙ СПАДЧЫНЫ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ ДЗІЦЯЧАЙ АЎДЫТОРЫІ

***Анатацыя.*** Разглядаюцца некаторыя шляхі прэзентацыі асобы і творчай спадчыны Францыска Скарына дзіцячай аўдыторыі: выкарыстанне літаратурных мастацкіх твораў пра аўтара, зварот да кінематографа і драматургіі, конкурсная дзейнасць і іншыя. Выяўленыя шляхі могуць быць карысныя пры прасоўванні аўтараў даўняй беларускай літаратуры, у працэсе вывучэння творчасці пісьменнікаў ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі.

***Ключавыя словы:*** Францыск Скарына, старажытная беларуская літаратура, прэзентацыя, прасоўванне, методыка выкладання беларускай літаратуры, дзіцячая аўдыторыя.

# THE WAYS OF PRESENTATION OF FRANCYSK SKARYNA'S PERSONALITY AND CREATIVE HERITAGE TO CHILDREN'S AUDIENCE

***Abstract.*** The separate ways of presenting Francysk Skaryna's personality and creative heritage to the children's audience are considered: the use of literary works about the author, the appeal to cinema and drama, the competitive activities and others. The revealed ways can be useful in the promotion of Belarusian ancient authors, in the process of studying the writer's work in the schools.

***Keywords:*** Francysk Skaryna, old Belarusian literature, presentation, promotion, methods of teaching Belarusian literature, children's audience.

Трансляцыя культурнай спадчыны дзецям з'яўляецца важным пытаннем для грамадства. У тым ліку дзякуючы знаёмству кожнага новага пакалення з аўтарамі і творамі, што набываюць статус класічных, адбываецца дыялог паміж традыцыяй і навацыямі, закладваюцца адпаведныя культурныя коды, узнікае агульная для пэўнага народа культурная прастора, прадстаўнікі якой могуць больш глыбока разумець адзін аднаго. Чым раней дзіцячая аўдыторыя пазнаёміцца са здабыткамі сваёй Айчыны, тым хутчэй стане адчуваць сваю далучанасць да яе.

Вялікая плынь разmaітай інфармацыі, якая абрыньваецца на сённяшняга выхаванца ці вучня, прымушае задумвацца аб актыўным прасоўванні якасных літаратурных тэкстаў. Разам з тым, варта памятаць, што дзіцячая аўдыторыя (ад 0 да 18 гадоў) не аднастайная: тое, што лёгкаўспрымальна і цікава для чатырнаццацігадовых падлеткаў, як правіла, з'яўляецца цяжкадаступным для шасцігадовых першакласнікаў. Дадзеную акалічнасць фіксуе і вопыт кнігавыдавецкіх прадпрыемстваў: удакладненне ўзроставай катэгорыі патэнцыяльных чытачоў кнігі, распрацоўка рэкламных кампаній і афармлення выданняў з улікам псіхалагічных адметнасцей абранай мэтавай аўдыторыі і г. д.

Існуюць навуковыя і вучэбныя публікацыі, якія разглядаюць праблему менавіта з гэтага боку [1]. У практычнай дзейнасці неабходныя шляхі

прэзентацыі мусяць выбірацца ў залежнасці ад узросту, падрыхтаванасці і іншых характарыстык канкрэтнай групы, на якую накіравана адпаведная праца.

Асобныя гістарычныя постаці прадстаўляюць краіну і на міжнародным узроўні, выступаюць яе своеасаблівым брэндам. Такую ролю адыгрывае Францыск Скарына, уклад якога ў развіццё ўсходнееўрапейскага кнігадрукавання цяжка пераацаніць. Менавіта на прыкладзе папулярызацыі ведаў пра славутага асветніка ніжэй вылучаны некаторыя шляхі прэзентацыі яго творчасці, якія могуць быць задзейнічаны падчас прадстаўлення і іншых творцаў (як старажытных, так і сучасных).

Адразу трэба падкрэсліць, што работа з даўняй беларускай літаратурай мае сваю спецыфіку. Дадзеныя тэксты адрозніваюцца па стылі, тэмах, патрабуюць featured рознага роду каментароў, звароту да гістарычнага кантэксту, тлумачэння пэўных рэалій, часам вымушаюць праводзіць дадатковую працу з матывацыяй да чытання і г.д. Гэта, з аднаго боку, накладвае абмежаванні, з іншага – адкрывае новыя гарызонты.

***1. Падручнікі, вучэбныя дапаможнікі.***

Пазіцыянаванне Францыска Скарыны ў вучэбных дапаможніках для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі выступае неад'емным складнікам прэзентацыі вобраза першадрукара перад дзіцячай аўдыторыяй. Усе вучні краіны прачытаюць пра славутага асветніка на ўроках літаратуры, гісторыі і мастацтва [2; 3; 4; 5] і атрымаюць базавыя веды з пазіцый розных навук (дысцыплін). Напрыклад, у вучэбным дапаможніку па літаратуры для 9 класа напісана: «Асобу Францыска Скарыны можна супаставіць толькі з тытанамі Адраджэння» [3, с. 23], «Цяжка паверыць, што ўсё здзейсненае ім зрабіў адзін чалавек. Сапраўды, Францыск Скарына – усходнеславянскі першадрукар. Ужо адным гэтым ён мог бы навечна застацца ў гісторыі славянскай культуры» [3, с. 26]. Вучэбны дапаможнік для 7 класа па гісторыі сцвярджае: «Цэнтральнай постаццю Адраджэння на Беларусі быў Францыск Скарына (каля 1490 – каля 1551). Аднак гэтая асоба мае значэнне не толькі ў межах Беларусі. Скарына – постаць агульнаеўрапейскага маштабу. Гэта не толькі беларускі, але і ўсходнеславянскі першадрукар. Ён быў пачынальнікам друкарскай справы ў Вялікім Княстве Літоўскім» [4, с. 40–41]. Працытаваныя вышэй словы дапамагаюць вучням сфарміраваць адпаведныя адносіны да славутай асобы.

***2. Біяграфічныя па змесце празаічныя творы, цэнтральнай фігурай якіх выступае пісьменнік.***

Творы, якія па-мастацку паказваюць жыццё і творчасць пісьменніка, яго характар, эпоху, могуць быць цікавыя дзецям як узоры для пераймання, як прыклады паспяховых стратэгій, што варта выкарыстаць, як арыенціры для пастаноўкі доўгатэрміновых мэт і задач. Традыцыйна вучням прапаноўваюць пазнаёміцца з кнігамі А. Лойкі «Францыск Скарына, або Сонца Маладзіковае» [6], «Скарына на Градчанах» [7], А. Клышкі «Францыск Скарына, альбо Як да нас прыйшла кніга» [8], М. Садковіча, Я. Львова «Георгій Скарына» [9]. Пры гэтым важна разумець, што ў такіх творах прысутнічаюць аўтарскія інтэрпрэтацыі, мастацкія дапушчэнні, расказваецца пра факты, якія сучасная навука не прызнае, заўважаюцца пэўныя ідэалагічныя ўстаноўкі.

***3. Творы з персанажам-літаратарам, напісаныя адмыслова для дзяцей.***

У мастацкіх выданнях для дзяцей Францыск Скарына можа станавіцца літаратурным персанажам, напрыклад, у наступных кнігах: Е. Нэмм «У гасцях у Францыска Скарыны» [10], С. Клімковіч «Скарбы першадрукара» [11]. Зразумела, што перад чытачамі ўжо не строга гістарычная асоба, а вобраз (часта казачны). Аднак такі падыход выклікае цікавасць у дзяцей і можа падштурхнуць да вывучэння сапраўднай біяграфіі пісьменніка-персанажа. Да таго ж, першадрукар можа выступаць і персанажам коміксаў, як аматарскіх, так і змешчаных у друкаваных выданнях, што блізка пэўнай частцы разглядаемай мэтавай аўдыторыі.

***4. Драматургічныя тэксты.***

Жыццёвы шлях Францыска Скарыны традыцыйна звяртае на сябе ўвагу драматургаў (гл.: [12] і інш.). У 2017 годзе па выніках адпаведнага конкурсу пабачыў свет зборнік новых п’ес пра першадрукара «Францыск Скарына і сучаснасць» [13]. П’еса пра пісьменніка, увасобленая на сцэне, застанецца ў памяці юнага гледача і паспрыяе знаёмству з творчасцю аўтара.

***5. Энцыклапедыі для дзяцей, навукова папулярныя выданні.***

Энцыклапедычныя выданні дазваляюць сістэмна пазнаёміцца з творчасцю пісьменніка. Пра першадрукара такую энцыклапедыю падрыхтаваў А. Суша [14]. Навукова-папулярныя выданні дапамагаюць у больш даступнай форме данесці патрэбныя пра гістарычную асобу звесткі. У ролі такога выдання пра Францыска Скарыну доўгі час выступала праца М. Прашковіча [15].

***6. Мастацкія фільмы.***

Мастацкія фільмы пра пісьменнікаў выклікаюць попыт з боку аматараў кінематографа. Знаёмства з творчасцю аўтара праз экранныя вобразы нярэдка стымулюе продажы яго кніг, запускае новую хвалю папулярнасці літаратара. У сувязі з гэтым узгадваецца фільм «Я, Францыск Скарына...» (1969, «Беларусьфільм», рэж. Б. Сцяпанаў) [16]. Аднак варта ўлічваць, што дадзены твор абапіраўся на навуковыя звесткі свайго часу. Скарыназнаўства ж пайшло далей, таму зараз наспявае час для новага біяграфічнага мастацкага фільма пра беларускага першадрукара.

***7. Дакументальныя фільмы, тэлеперадачы.***

Дакументальныя фільмы (тэлеперадачы) дапамагаюць за даволі кароткі час пазнаёміць з жыццёвым шляхам пісьменніка, паказаць шматлікі ілюстрацыйны матэрыял, меркаванні экспертаў, данесці нестандартны погляд. Пра Францыска Скарыну існуе немалая колькасць такіх праектаў. Для прыкладу назавём наступныя: «Францыск Скарына: чытаючы гравюры...» (2017, рэж. А. Лявай) [17]; «Цікавыя факты жыцця славутага асветніка Беларусі Францыска Скарыны» (2016) [18]. Неабходна памятаць, што часам відэапрадукты могуць прапаноўваць ненавуковыя погляды на рэчаіснасць, абапірацца на міфы і забабоны, таму абавязковымі з’яўляюцца папярэдні адбор і аналіз фільмаў (тэлеперадач) перад прадстаўленнем іх вучням.

***8. Мультыплікацыя.***

Значны патэнцыял ў прэзентацыі пісьменніцкай працы дзецям мае мультыплікацыя. Пры вывучэнні спадчыны Францыска Скарыны можна звярнуцца да мультыплікацыйнага фільма “Магістр вольных мастацтваў” (2018,

«Беларусьфільм», рэж. А. Пяткевіч) [19]. Пазітыўную ролю можа адыгрываць і мультыплікацыя, змешчаная ў інтэрнэт-прасторы (у тым ліку аматарская).

***9. Праекты ў перыядычных выданнях.***

Стымуляваць цікавасць да чытання канкрэтных аўтараў могуць літаратурныя праекты ў перыядычных выданнях. Напрыклад, часопіс «Вясёлка» (https://www.veselka.by) размяшчаў матэрыялы для сваіх чытачоў з нагоды 500-годдзя беларускага кнігадруку. Інтэрактыўныя праекты бываюць, як правіла, больш эфектыўнымі. Яны таксама моцна залежаць ад характарыстык аўдыторыі выдання.

***10. Літаратурныя конкурсы.***

Літаратурныя конкурсы (вышэй ўжо узгадваўся драматургічны конкурс) заахвочваюць дзяцей да творчасці. Калі конкурс прысвечаны пісьменніку, гэта прымушае пазнаёміцца з яго ўкладам у культуру. Конкурсы можна праводзіць і ў межах ўстановы адукацыі (класа). Заданне можа быць, напрыклад, такім: «Напішыце кароткае апавяданне (да 2000 знакаў з прабеламі), галоўным героем якога будзе Францыск Скарына».

***11. Дзіцячыя праекты.***

Праекты, выканаўцамі якіх з’яўляюцца дзеці, дазваляюць ім узаемадзейнічаць са спадчынай пісьменніка, пераасэнсоўваць яе. Напрыклад, можна прапанаваць вучням: 1) стварыць партрэтную гэлерэю Францыска Скарыны; 2) выбраць 10 найбольш адметных кніг пра першадрукара і напісаць на іх водгук; 3) скласці каталог дакументальных фільмаў пра асветніка і г.д. Выдатныя ідэі праектаў могуць сыходзіць і ад саміх дзяцей.

***12. Нефармальная адукацыя, гурткі, аб’яднанні, вечарыны, канферэнцыі.***

У межах пазаўрочнай работы ёсць магчымасць эфектыўна вывучаць творчую спадчыну беларускіх пісьменнікаў. Напрыклад, літаратурныя, творчыя і навукова-даследчыя гурткі, краязнаўчыя аб’яднанні вывучаюць у тым ліку і гісторыю кнігадрукавання. Пры Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі працуе «Клуб кніжных прафесараў» [20]. На вечарынах і канферэнцыях вучні могуць падзяліцца сваімі напрацоўкамі. На падобныя мерапрыемствы нярэдка запрашацца эксперты (пісьменнікі).

***13. Выставы.***

Шматлікія выставы ў розных установах, прымеркаваныя да Дня беларускага пісьменства і іншых дат, звязаных з дзейнасцю Францыска Скарыны, канцэнтруюць увагу чытачоў на значэнні адпаведных культурных скарбаў. Выставу кніг можна арганізаваць сумесна з вучнямі на базе бібліятэкі ўстановы адукацыі.

***14. Выкарыстанне вобраза пісьменніка і яго твораў у дызайне прадукцыі, пры распрацоўцы брэндаў і інш.***

Наяўнасць партрэта Францыска Скарыны, яго шрыфтоў, тэкстаў на разнастайнай прадукцыі (кнігах, нататніках, кашулях, кубках і г.д.) нагадвае (у якасці медыятэксту) усім, хто сутыкаецца з такімі аб’ектамі, пра ролю гэтай асобы ў грамадстве, адсылае да першакрыніц, якія падаюцца як у перапрацаваным (матэрыял, кропка адліку для работы), так і ў арыгінальным выглядзе (фактычна, цытата). Спадчына першадрукара можа прымяняцца пры распрацоўцы пазнавальных брэндаў.

***15. Цытаты (афарызмы) аўтара.***

Цытаты пісьменніка могуць набываць самастойнае жыццё. Выслоўе Францыска Скарыны «Понеже…» было перакладзена на шматлікія мовы свету [21]. Цытаты могуць трывала ўваходзіць у мову, культурную прастору і пры ўзнаўленні накіроўваць да іх аўтара. Зразумела, што можна прадставіць пісьменніка праз яго словы, найбольш удалыя фрагменты тэкстаў, аднак трэба памятаць пра пэўныя праблемы, звязаныя з цытаваннем, што ўзнікаюць, як у вусным маўленні, так і ў друкаваных выданнях, інтэрнэце (напрыклад, гл.: [22]).

***16. Факсімільныя выданні.***

Факсімільныя выданні дазваляюць часткова «дакрануцца» да спадчыны аўтара, паказаць, як выглядала кніга раней. Гэта дапамагае заахвоціць пэўную частку дзіцячай аўдыторыі да працы са старажытнымі тэкстамі. Вялікае значэнне мае факсімільнае ўзнаўленне выданняў Францыска Скарыны [23].

***17. Падрыхтоўка тэкстаў аўтара для чытання дзіцячай аўдыторыяй.***

Старажытныя тэксты часта неабходна адаптаваць, перакладаць на сучасную мову, таксама да іх бывае мэтазгодна распрацоўваць каментарыі, бо ў арыгінальным выглядзе яны цяжкадаступныя для чытання дзецьмі Пры сутыкненні вучня са спецыяльна падрыхтаваным «прыгожым пісьменствам» некаторыя бар’еры могуць здымацца. Напрыклад, тэксты Францыска Скарыны пераклаў і адрасаваў «шырокаму колу чытачоў» І. Саверчанка [24]. Такі шлях прэзентацыі не варта недаацэньваць.

***18. Кнігі, прысвечаныя пісьменніку, тэксты-прысвячэнні.***

Славутым пісьменнікам прысвячаюць кнігі і літаратурныя творы. Іх наяўнасць указвае на прызнанне аўтара, на магчымасць шырокага вывучэння яго спадчыны ў грамадстве. Францыску Скарыну неаднарозова прысвячалі свае тэксты іншыя творцы (напрыклад, гл.: [25]). Аўтара карысна прадстаўляць праз творчасць іншых літаратараў, бо гэта падкрэслівае яго ўплыў на далейшае развіццё літаратуры.

***19. Прасоўванне аўтара ў інтэрнэт-прасторы.***

Прысутнасць пісьменніка ў інтэрнэт-прасторы з’яўляецца сёння амаль абавязковай. Не выключэннем выступаюць тут і старажытныя аўтары. Запыт “Францыск Скарына” ў пошукавых сістэмах дае вялікую колькасць спасылак, у тым ліку на такія рэсурсы, як Вікіпедыя, Нацыянальная бібліятэка Беларусі і інш.

***20. Гульні, квэсты, вэб-квэсты.***

Знаёмства з аўтарам у гульнявой форме дазваляе стварыць вакол яго пазітыўную атмасферу. Віктарыны, гульні, квэсты, вэб-квэсты могуць быць моцнымі інструментамі ў папулярызацыі творчасці, напрыклад: [26]. Элементы гульні нярэдка выкарыстоўваюць на сутсрэчах з чытачамі дзіцячыя пісьменнікі.

***21. Музейныя заняткі.***

Музейная педагогіка мае сур’ёзныя магчымасці, якія далёка не поўна выкарыстоўваюцца ў прасоўванні і навучанні (гл.: [27]). Работа ў антуражы экспанатаў выклікае больш яскравыя эмоцыі, дазваляе рознабакова ўплываць на чытача падчас прэзентацыі і г. д. Зараз прапаноўваюцца музейныя заняткі ў тым ліку і па творчасці Францыска Скарыны [28].

***22. Радыёперадачы.***

Знаёміць з літаратурай можна і праз радыёперадачы. Значная колькасць людзей добра апрацоўвае інфармацыю праз слыхавы канал. Работа з

аўдыёматэрыяламі можа ісці паралельна з механічнымі дзеяннямі чалавека (напрыклад, па дарозе ва ўстанову адукацыі, падчас выканання хатніх абавязкаў). Радыёперадачы пра пісьменнікаў і радыёпастаноўкі патрабуюць больш актыўнай рэкламы сярод вучняў.

***23. Пісьменнік (яго тэксты) у творах іншых відаў мастацтва.***

Асоба пісьменніка, яго творы, героі, біяграфія кладуцца ў падмурак твораў розных відаў мастацтва (разам са згаданымі вышэй): музыка, жывапіс, графіка і г. д. Францыск Скарына часта выступае крыніцай натхнення для творцаў, што зноў жа паказвае ўключанасць аўтара ў культурную прастору.

***24. Стварэнне дзецьмі ўласных твораў.***

Важным пры прасоўванні творчасці аўтара выяўляецца стварэнне магчымасці для ўласнай творчасці чытачоў-дзяцей. Напрыклад, вучням можна прапанаваць наступныя заданні: «Намалюйце партрэт Францыска Скарыны, на якім адлюстраваны яго дасягненні. Прарэкламуйце свой твор перад аднакласнікамі»; «Выкарыстайце шрыфт Францыска Скарыны пры афармленні вокладкі свайго любімага твора».

Такім чынам, усе акрэсленыя вышэй шляхі прэзентацыі асобы і творчай спадчыны Францыска Скарыны маюць дастаткова высокі патэнцыял, што паказвае і практыка звароту да іх. Натуральна, прыведзены пералік не вычарпальны і можа быць пашыраны. Эфектыўнасць прымянення кожнага з прапанаваных варыянтаў у значнай ступені залежыць ад канкрэтнай мэтавай аўдыторыі. Вынікі дадзенага даследвання могуць быць паспяхова выкарыстаны ў працэсе папулярызацыі аўтараў і іх твораў.

**Спіс выкарыстанай літаратуры:**

1. Шишкина, Н. И. Реклама и продвижение книжных изданий: учебное пособие для студентов учреждений высшего образования по специальности «Издательское дело» / Н. И. Шишкина. – Минск : Республиканский институт высшей школы, 2021. – 335 с.

2. Беларуская літаратура: вучэб. дапам. для 10-га кл. устаноў агул. сяр. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання (з электр. дадаткам для павыш. узроўню) / пад. рэд. А. П. Бязлепкінай-Чарнякевіч, І. Д. Воюш. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – 294 с.

3. Беларуская літаратура: вучэб. дапам. для 9 кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / пад рэд. В. У. Праскаловіч, В. П. Рагойшы. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2019. – 286 с.

4. Гісторыя Беларусі, XVI—XVIII стст. : вучэб. дапам. для 7-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / пад рэд. В. А. Вароніна, А. А. Скеп’ян. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2017. – 214 с.

5. Искусство (отечественная и мировая художественная культура): учебное пособие для 8 кл. учреждений общего среднего образования с русским языком обучения (с электронным приложением) / под ред. С. И. Колбышевой. – Минск : «Адукацыя і выхаванне», 2018. – 191 с.

6. Лойка, А. Францыск Скарына, або Сонца Маладзіковае : раман-эсэ : для сярэд. і ст. шк. узросту / А. Лойка. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2009. – 366 с.

7. Лойка, А. Скарына на Градчанах : аповесць : для мал. і сярэд. шк. узросту / А. Лойка ; маст. В. Мікіта. – Мінск : Юнацтва, 1990. – 111 с.

8. Клышка, А. Францыск Скарына, альбо Як да нас прыйшла кніга : для малод. і сярэд. шк. узросту / А. Клышка. – Мінск : Беларусь, 2016. – 125 с.
9. Садкович, М. Георгий Скорина : исторический роман : для ст. шк. возраста / М. Садкович, Е. Львов. – М. : Детская литература, 1988. – 382 с.
10. Нэмм, Е. В гостях у Франциска Скорины : сказка / Ева Нэмм ; худож. Е. Першина. – Минск : Звязда, 2016. – 48 с.
11. Климкович, С. В. Сокровища первопечатника: приключенческая повесть: для мл. и ср. шк. возраста / С. В. Климкович. – Минск : Книжный Дом, 2017. – 286 с.
12. Скобелев, Э. Сыны Отечества. Исторические драмы : для ст. шк. возраста / Э. Скобелев. – Минск : Беларусь, 1999. – 302 с. – (Школьная библиотека).
13. Францыск Скарына і сучаснасць : зб. п'ес / Нац. б-ка Беларусі, Рэсп. тэатр беларус. драматургіі, Цэнтр беларус. драматургіі. – Мінск : Нац. б-ка Беларусі, 2017. – 334 с.
14. Суша, А. А. Францыск Скарына : у 3 ч. / А. А. Суша. – Мінск : Беларус. Энцыкл., 2016. – (Беларус. дзіцячая энцыкл.).
15. Прашковіч, М. І. Францішак Скарына – беларускі першадрукар / М. І. Прашковіч. – Мінск : Народ. асвета, 1970. – 93с. – (Школьнікам – аб гісторыі БССР).
16. Я, Франциск Скорина... [Электронный ресурс] // Кинопоиск. – Режим доступа: kinopoisk.ru/film/475983/. – Дата доступа: 1.12.2022.
17. Францыск Скарына: чытаючы гравюры... | ЗАПІСКІ НА ПАЛЯХ [Электронны рэсурс] // Беларусь 3: youtube-канал. – Рэжым доступу: https://www.youtube.com/watch?v=ZQuBKUClYro. – Дата доступу: 1.12.2022.
18. Цікавыя факты жыцця славутага асветніка Беларусі Францыска Скарыны [Электронны рэсурс] // CTVBY: youtube-канал. – Рэжым доступу: https://www.youtube.com/watch?v=qJJqVj2K9tc. – Дата доступу: 1.12.2022.
19. Магистр вольных искусств (2018) [Электронный ресурс] // Кинопоиск. – Режим доступа: https://www.kinopoisk.ru/film/4535994/. – Дата доступа: 1.12.2022.
20. Клуб кніжных прафесараў [Электронны рэсурс] // Нацыянальная бібліятэка Беларусі. – Рэжым доступу: https://www.nlb.by/by/pas–lugi/satsyyakulturnyya-paslugi/praekt-u-gostsi-da-knig/klub-knizhnykh-prafesara/. – Дата доступу: 1.12.2022.
21. Францыск Скарына на мовах народаў свету / уклад., паслясл. А. Карлюкевіча. – Выд. 3-е, дап. – Мінск : Паліграфкамбінат, 2018. – 143 с.
22. Акушэвіч, А. А. Цытаты Францыска Скарыны ў інтэрнэт-прасторы / А. А. Акушэвіч // Скориновские чтения – 2021: роль книги в современном обществе: материалы V Междунар. форума, 07–08 окт. 2021 г. / под ред. В. И. Куликовича. – Минск, 2021. – С. 186–189.
23. Кніжная спадчына Францыска Скарыны : у 20 т. / Нац. б-ка Беларусі. – Факс. узнаўл.– Мінск : Нац. б-ка Беларусі, 2013–2017.
24. Скарына, Ф. Выбраныя творы / Ф. Скарына ; уклад, прадм., пер. на беларус. мову І. В. Саверчанкі. – Мінск : Беларус. навука, 2008. – 110 с.
25. Слаўны сын Беларусі. Кніга пра Скарыну : для сярэд. і ст. шк. узросту / прадм. А. І. Мальдзіса ; уклад. і пасляслоўе С. С. Панізніка ; маст. Р. У. Кондрад. – Мінск : Юнацтва, 1994. – 254 с. – (Школьная бібліятэка).

26. Казачэнка, І. Дарогамі першадрукароў : вэб-квэст (9 клас) / І. Казачэнка // Роднае слова. – 2017. – № 5. – С. 67–68.
27. Шляхтина, Л. М. Музейная педагогика : учебно-методическое пособие / Л. М. Шляхтина. – СПб. : СПбГИК, 2021. – 60 с.
28. Музейныя заняткі [Электронны рэсурс] // Музей беларускага кнігадрукавання. – Рэжым доступу: http://book.polotsk.museum.by/be/node/49796. – Дата доступу: 1.12.2022.



**Габдулхаков Валерьян Фаритович (V. F. Gabdulkhakov),** доктор педагогических наук, профессор, руководитель НОЦ педагогических исследований Казанского федерального университета *(г. Казань, Республика Татарстан), pr_gabdulhakov@mail.ru*



**Зиннурова Альфия Фидаиловна (A. F. Zinnurova),** кандидат педагогических наук, доцент Казанского государственного архитектурно-строительного университета *(г. Казань, Республика Татарстан)*

УДК 159.922.5

# МАНКУРТИЗМ В ЭТНИЧЕСКОМ СОЗНАНИИ УЧАСТНИКОВ ОБРАЗОВАТЕЛЬНОГО ПРОЦЕССА

***Аннотация.*** Цель статьи – показать особенности проявления манкуртизма в сознании участников образовательного процесса. Манкуртизм понимается как отрыв личности от этнических корней. Это явление сейчас не только социальное, культурное, но и